Падтрымай "Вясну" на PATREON

Баранавічы: за Дзень Волі – пад суд

02.05.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў
Крыніца: Радыё "Рацыя"



Грамадскія актывісты з Баранавічаў Уладзімір Гундар і Юрый Казакевіч атрымалі позвы з Баранавіцкага суда. У позвах паведамляецца, што актывісты выклікаюцца ў суд 5 траўня а 12 гадзіне ў якасці асобаў, у адносінах да якіх вядзецца адміністрацыйны працэс. Судзіць іх будуць за віншаванне грамадзян на гарадской плошчы з Днём Волі і 98-мі ўгодкамі Беларускай Народнай Рэспублікі.

Уладзімір Гундар кажа: — Як міліцыянт сказаў: «Парушэння грамадскага парадку не было, але парушэнне закону — было». Людзі ставіліся вельмі прыхільна, з задавальненем бралі кветкі, і нават міліцыянт, які быў у цывільным. Мы яго потым пазналі, бо ён сядзеў у кабінеце, калі я прыйшоў. Дык і ён узяў з задавальненнем гваздзіку і нічога дрэннага нам не гаварыў.

Уладзімір Гундар упэўнены, што іх пакараюць, і што рашэнне ўжо гатовае. Як гэта было ў судзе над актывістам Грыкам, суд над якім доўжыўся 6 хвілін. Розніца будзе толькі ў памеры штрафу. Паводле Гундара, цяпер у нас не суды, а канторы па папаўненні грошай у бюджэт.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS